Чацвер, 05 Лістапад 2020

Міколу Качурцу прысудзілі 15 сутак арышту. Ён не затрыманы

Друкаваць (/news/sud/item/3788-jon-ne-zatrymany?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=7bcf89f89da3e6d3278a0a0df5cbae7f73909a7c)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(/media/k2/items/cache/71787aeeca0dfb525994d8cc2fad8c82_XL.jpg)

Мікола Качурэц

Суд Першамайскага раёну Віцебску 5 лістапада пастанавіў пакараць вядомага віцебскага актывіста Міколу Качурца адміністрацыйным арыштам на 15 сутак за ўдзел у вулічным шэсці, якое адбылося 20 верасня. На суд Мікола Качурэц не прыйшоў. Ягоную справу разглядала суддзя Вераніка Барысава.

Паводле міліцэйскага пратаколу, **Мікалай Качурэц** 20 верасня *«рухаўся ў групе грамадзян, якія скандавалі «Жыве Беларусь!» і пляскалі ў далоні»*. На першым паседжанні, якое прайшло 3 лістапада, сведкам з боку міліцыі выступіў намеснік начальніка аддзелу аховы правапарадку і прафілактыкі Першамайскага РАУС маёр **Вадзім Склімянок**. Ён паведаміў, што Качурэц з'яўляецца злосным парушальнікам заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і што сёлета ўжо 4 разы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці паводле арт. 23.34 КаАП.

Вінаватасць актывіста міліцыянты даказвалі і праз відэазапісы, зробленыя падчас шэсця, на якіх маёр Склімянок пазнаў абвінавачанага. Але 3 лістапада, з прычыны адсутнасці Качурца, рашэнне суддзя не агучыла.

У чацвер 5 лістапада суддзя **Вераніка Барысава** паведаміла, што міліцэйская брыгада выязджала на месца пражывання Мікалая Качурца, але яго не знайшла. *«Дзверы зачыненыя і падпёртыя рыдлёўкай»*, – рапартавалі супрацоўнікі МУС.

Зважаючы на гэтыя абставіны, суддзя вырашыла завяршыць справу без удзелу абвінавачанага і вынесла вердыкт: прызнаць Міколу Качурца вінаватым у правапарушэнні паводле **ч.3 арт. 23.34 КаАП** і пакараць яго **адміністрацыйным арыштам на 15 сутак**.

Апошні раз Качурца затрымлівалі 9 жніўня. Пры затрыманні яго моцна збілі амапаўцы. Суд, які адбыўся 12 жніўня ў ІЧУ, прысудзіў яму 15 сутак адміністрацыйнага арышту, якія Мікола Качурэц да канца не адбыў – быў вызвалены 14 жніўня разам з іншымі затрыманымі. Цяпер, у выпадку затрымання, не адбытыя раней 10 сутак могуць дадаць да прысуджаных 15-ці.

Мікола Качурэц прынцыпова не ходзіць на суды, бо лічыць іх залежнымі ад чалавека, які ў Беларусі прызначае суддзяў.

Зміцер Міраш

Апублікавана ў Суд (/news/sud)
Тэгі: Мікола Качурэц (/itemlist/tag/Мікола%20Качурэц) артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП) СІЗА (/itemlist/tag/СІЗА) Вераніка Барысава (/itemlist/tag/Вераніка%20Барысава)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Вядомага гітарнага майстра Аляксандра Баярына пакаралі за ўдзел у шэсці штрафам (/news/sud/item/3787-pakarali-za-udzel-u-shestsi) Арыштам на 7 сутак за выказванне меркавання пакараны ў Полацку Генадзь Бердзянёў » (/news/sud/item/3789-aryshtam-na-7-sutak)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3788-jon-ne-zatrymany#startOfPageId3788)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/)/t[illegible]